ДУА "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі"

Эсэ
Аўтар Янушка Іван
Клас 7

# Калі я вырасту…

Калі я вырасту, то пайду ў школу…

Як прыемна і лёгка ісці гэтай свежай вераснёўскай раніцай, залітай лагодным сонейкам. Сёння першага верасня – Дзень ведаў. Моўчкі ўсміхаюся, уяўляючы сустрэчу са сваімі вучнямі. Я настаўнік гісторыі і дырэктар Песачанскай установы адукацыі. Добра, што я дабіўся сваёй мэты і паступіў на спецыяльнасць, якая мне па душы. Гэта была мара майго дзяцінства.

Як змяніўся родны аграгарадок за 20 гадоў! Я помню, якім прыгожым ён здаваўся мне тады, многа гадоў таму. За гэты час ён стаў яшчэ прыгажэй. Роўныя дарожкі, акуратныя рознакаляровыя домікі, пышныя прысады і шмат кветак вакол. У наш час ні ў кога няма праблем. Людзі вынайшлі столькі рэчаў, каб палегчыць сабе жыццё! Усё стала так даступна! І гэта цудоўна, бо цяпер кожны больш часу прысвячае сваёй сям'і, здароўю і спорту, адпачынку на прыродзе і, канечне ж, любімай справе.

Ля некаторых сядзіб гаспадары няспешна корпаюцца ў дагледжаных гародчыках і садках, а ўбачыўшы мяне, вітаюцца і віншуюць са святам. Да прафесіі настаўніка з павагай адносіліся ва ўсе часы. Напэўна, таму, што настаўнік – гэта не проста высокаадукаваны чалавек, а самы мудры і адказны. Настаўнік – прыклад для акружаючых.

Вось і ўстанова адукацыі – вялікі светла-блакітны будынак са шкляным купалам, у якім ужо насцеж расчынены дзверы ў чаканні дзетвары. Фае заліта сонечнымі праменнямі, у акварыуме грацыёзна плаваюць экзатычныя рыбы. Тут стаяць канапы, дзе вучні могуць адпачыць, пагартаць кнігі і часопісы. У вучэбных кабінетах – камфортная мэбля, сучасныя дошкі,

маніторы,  Інтэрнэту. Тлумачэнне тэмы у наш час суправаджаецца паказам кінафрагментаў, таму вучні лёгка засвойваюць новы матэрыял. Правяраюць веды камп’ютары, з якімі  школьнікі і настаўнікі “на ты”. Усё проста і цікава!

А вось мы каля спартзалы! Яна вялікая, з трэнажорамі і басейнам! Ва ўстанове адукацыі, што я узначальваю, створаны ўсе ўмовы для здаровага ладу жыцця навучэнцаў і педагогаў.

Пасля заняткаў вучні не бягуць дадому, а займаюцца навуковай дзейнасцю – у лабараторыях, у навуковых гуртках. У настаўнікаў вялікае жаданне працаваць, бо у іх дастойная зарплата, ёсць усе аўдыё- і відэаматэрыялы для навучання, і галоўнае –  яны займаюцца важнай справай – выхаваннем будучых грамадзян Беларусі.

Я таксама кірую гісторыка-краязнаўчым гуртком. В вучнямі вядзём пошукавую работу, ходзім у экспедыцыі. Вынікам гэтага становяцца прэзентацыі і даследчыцкія праекты, з якімі удзельнічаем ў навуковых канферэнцыях, у тым ліку міжнародных – праз тэлемосты. Гэта высакародная справа – вывучаць мінулае роднага краю, ведаць свае карані. Тут, на малой радзіме, няма нічога нязначнага, усё аднолькава дарагое.  І ад гэтага, здаецца, напаўняешся новымі сіламі.

А вось і першыя жаўранкі-вучні. Вітаю вас! З Днём ведаў!